# РАЗНАВІДНАСЦІ ЭЎФАНІЧНЫХ АЛІТЭРАЦЫЙНЫХ ПАЎТОРАЎ У ПАЭЗІІ Р.БАРАДУЛІНА

**В.А. Сурыновіч**

У лінгвістыцы пад мілагучнасцю разумеецца такая пабудова эўфанічнай адзінкі, пры якой ужытыя гукаспалучэнні (або асобныя гукі) у паэтычнай мове будуць прыемнымі для слыхавога успрыняцця і таксама зручнымі для вымаўлення. Эўфанічнай адзінкай будзем лічыць такое спалучэнне гукаў, якое вымаўляецца пад адным націскам (у фанетыцы для абазначэння яе выкарыстоўваецца аналагічны тэрмін "фанетычнае слова").

Найчасцей у эўфанічных адзінках паэтычнай мовы сустракаюцца алітэрацыйныя паўторы. Гэта тлумачыцца дамінуючым становішчам зычных у фанетычнай сістэме беларускай мовы. З большай пэўнасцю наш слых успрымае паўтарэнне зычных, якія знаходзяцца ў перадпаціскных складах і ў абсалютным пачатку слова. Мы заўважаем паўтарэнне не толькі аднолькавых гукаў, але і падобных па якой-небудзь прыкмеце (месцу ці спосабу утварэння, звонкасці – глухасці, цвёрдасці – мяккасці і інш.). Алітэрацыйныя паўторы спрыяюць стварэнню шматлікіх прадметна-сэнсавых асацыяцый.

Класіфікацыі эўфанічных паўтораў у навуковай літаратуры да гэтага часу яшчэ недастаткова поўна распрацаваны. Мы паспрабуем апісаць некаторыя віды алітэрацыйных паўтораў беларускай мовы, выкарыстоўваючы прыклады, узятыя з творчасці Р.Барадуліна, аднаго з агульнапрызнаных майстраў алітэрацый у беларускай паэзіі.

1) Па колькасці гукаў, што паўтараюцца, паўторы дзеляцца на : *двухгукавыя*

ГРунвальд – куРГан і ГРуган,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

ГРунвальд – ДЗяДоўнік і ДЗіДа [258];
Ляшчыннік МоЛіцца на лог.
МаЛіннік МЛее ад блазенства
На ВоЗе ВоЗера ВяЗецца
Аблокаў МаЛады мурог [274];
*трохгукавыя*
ЧаРаТоў ЧапуРысТых ЧупРына [266];
СТРыгуць цішыню СТРыжамі,
Над СТРэхамі, над крыжамі [23];
Я у ПРадаўШчыцы наПРаШу таго,
Які шуміць мне ўсё ўвушшу [77] і інш.

2) У залежнасці ад колькасці паўтарэння адных і тых жа гукаў паўторы можна падзяліць на простыя і шматразовыя. *Простыя*:

І суседзі СЦіскалі ў злоСЦі раты [176];
НатурШЧыкі, падзёнШЧыкі мастацтва [138];
*шматразовыя*:
АдмеРаць Шоўку паРаШутнага,
АдмеРаць Шуму папРаШу [77];
ПЛанета гаЛаву ПасыПЛе ПоПеЛам [180].

3) Выдзеліць разнавіднасці паўтораў можна і ў залежнасці ад таго, у якім парадку ідуць адзін за адным гукі ў групах, што паўтараюцца. Калі абазначыць гукі першай групы літарамі А, В, С і г.д., то можна вызначыць формулу паўтору ў выглядзе гэтых самых літар, размешчаных у тым парадку, у якім яны сустракаюцца ў другой групе. Разгледзім наступныя прыклады.

Двухгукавы паўтор АВ (той самы парадак, як і ў першай групе):
Згінь, КРумкач, не КРужы,
Беларусь на КРыжы [177];
ВА (адваротны, або "хіастычны" паўтор):
ЗмРок паРаніўся Злосцю дзідаў [180];
ГуБы паганскім БаГам
Крывіць да здрады агіда [258];
Дык расці шчасЛіВа і ВяЛіка [168].
Камбінацыі трохгукавых паўтораў: АВС
Усё свае чакае кары –
АД ЧаЛавека Да пЧаЛы [314];
Зві наПРуЖку дый тужэй аПеРаЖыся [315];
МіСТыка. МіСТэрыя. МайСТэрня.
Маці,
Маціевіч. Маг. МаСТак. [362];
АСВ Я жыву, чакаючы цябе,
А у ЗаЛіВе ўжо З'яВіўся Лебедзь [137];
СВА На платах НаБРалі ветру у Рот зБаНкі [315] і інш.

Алітэрацыйныя паўторы можна раскласіфікаваць і па іх становішчы ў рытмічных адзінках. Тут выдзяляюць *кальцо*:

БяРОза голая, як ісціна,

Ды сок прачнуўся пад каРОй [160];
Як даўні доўг, расце
Мой прыхаваны сораМ [90];
Вечны Тупат ног і крылаў лопаТ [91];
А застануся
Маміным сынаМ [91];
*стык*:
У старэйшых хацелі хадзіць бРАты,
ВыРАкаліся быць крывічамі [176];
На хвасце ў сарокі ПеР'іна
НеРаважыць ісціну рахубай [286];
*анафара (скрэп)*:
ЗеЛле горкае
ЗаЛіваць спехам [274];
На ДРатах ДРыжаць шпакі [279];
ПаВук, як іншапланецянін,
На ПаВуцінні за акном
ПаВіс. [285];
*эпіфара*:
Паветраны шарык РоХкаў,
Пасля ў яго насыпалі гаРоХу [282] і інш.

Самымі мілагучнымі сярод алітэрацыйных паўтораў будуць з'яўляцца паўторы санорных гукаў, за выключэннем гука [р], затым можна назваць фрыкатыўныя гукі, потым выбухныя і, нарэшце, афрыкаты і гук [р].

Такім чынам, з вышэй прыведзеных прыкладаў відаць, наколькі разнастайнай з'яўляецца сістэма алітэрацыйных паўтораў. Яна патрабуе яшчэ больш падрабязнага і пільнага даследавання.

Літаратура:

1. Барадулін Р. Збор твораў: Т.2. Вершы.- Мн.: Маст.літ., 1998.- 382 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ